# ГЭТАЕ СВЯТА ЗАЎЖДЫ БЫЛО АСАБЛІВЫМ — І ПРЫ ЖЫЦЦІ ДЗЯДУЛІ, І ЦЯПЕР

**Вайна... Само гэта слова ў некага выклікае страх, у некага — балючыя ўспаміны, а то і слёзы. Маё пакаленне ведае пра яе з кніг, дакументальнай хронікі, з мастацкіх фільмаў і расказаў родных.**

***З прадзедам Васілём Аляксандравічам Мартосам, ураджэнцам в. Круты Бераг Нясвіжскага раёна, мы, калі можна так сказаць, размінуліся ў часе: мне было шэсць месяцаў, калі ён памёр. А нарадзіўся — у 1909-м у невялікай па тым часе вясковай сям'і, дзе былі яшчэ брат і дзве сястры. Прадзед — найстарэйшы, а значыць, ён, калі не стала бацькі, адбудоўваў пасля пажару хату, карчаваў пні, каб павялічыць надзел зямлі, перавозіў сям'ю то на хутар, то назад у вёску.***

***У 1936 годзе гэты малады гаспадар ажаніўся (па словах бабулі, «у пятніцу пасля Сёмухі»), каб пражыць у шлюбе 62 гады, нарадзіць пяцярых дзяцей (траіх, на жаль, пахавалі) і пры гэтым самым страшным выпрабаваннем для сям'і і ўсёй вялікай краіны лічыць менавіта вайну.***

...Пра жыццё пад акупацыяй ні прадзед, ні прабабуля распавядаць не любілі. Успаміналі толькі, што іх старэйшая дачушка Люся, першы раз убачыўшы немцаў, страшэнна спужалася, захварэла і ў чатыры гадкі памерла.

У рады Чырвонай Арміі Васіля Аляксандравіча прызвалі ў 1944-м. З сям'ёй развітваўся са слязамі на вачах: баяўся, што болей не ўбачыць, што без яго абы-якімі могуць вырасці сыны — сямігадовы Саша і аднагадовы Антон.

*(Развітанне... Мо назусім... Скупыя мужчынскія слёзы... Маленькія ручкі дзяцей у вялікіх агрубелых ад працы бацькавых... Варта ўявіць, і таксама заплачаш.)*

Потым была «вучэбка» ва ўкраінскім Оўручы, служба ў 140-й стралковай дывізіі...

Гэтую інфармацыю мы адшукалі пасля смерці прадзеда на сайце «podvignaroda.ru» і даведаліся, за якія асаблівыя заслугі (радавым інакш не давалі) прадзед быў прадстаўлены да ордэна Чырвонай Зоркі. Цытата: «Тав. Мартос, выконваючы абавязкі сувязнога пры аддзеле тылу, заўсёды, у любы час дня і ночы дастаўляў баявыя загады часцям дывізіі і начальнікам службаў. У баях за Савецкую Радзіму ў раёне Карпат быў цяжка паранены...»

З дакумента зразумела, што камандзір пісаў хадайніцтва, а якую ўзнагароду атрымае баец, дапісана пасля. Пацверджаннем таму яшчэ адзін рассакрэчаны дакумент — загад па 140-й стралковай дывізіі ад 14 верасня 1945 г. аб узнагароджанні ордэнам Чырвонай Зоркі радавога Мартоса Васіля Аляксандравіча, стралка камендацкага ўзвода: «За ўзорнае выкананне баявых заданняў... і праяўленыя пры гэтым доблесць і мужнасць».

Пра адзін з выпадкаў прадзед успамінаў. Неяк, даставіўшы пакет дакументаў, пачуў ад афіцэра надзвычайныя словы падзякі!



(Можа, дакументы былі нейкай асаблівай важнасці, а можа, у штабе ўжо не спадзяваліся іх атрымаць?)

Быў яшчэ і медаль «За баявыя заслугі», паводле дакументаў: «За спыненне контратакі праціўніка і атрыманае ў выніку раненне».

...Вайну мой прадзед закончыў на тэрыторыі Чэхаславакіі (дакументальных пацвярджэнняў гэтаму ў сямейным архіве, на жаль, няма) і ўжо ў мірны час атрымаў Ордэн Айчыннай вайны другой ступені.

Пра тое, як ваяваў, прадзед амаль не расказваў: лічыў, што кожнае пакаленне «нясе свой крыж», на яго долю выпала вайна... А вось пра баявых таварышаў-землякоў (ваяваў разам з Барысам Турко з в. Завітая) заўсёды гаварыў з цеплынёй. Гэтыя дзве «прыгоды», па словах мамы, гучалі найчасцей.

На паверцы малады лейтэнанцік заўважыў у дзядулі нацельны крыжык і загадаў неадкладна зняць. Баец (ну, вядома ж, рызыкуючы трапіць пад трыбунал) адказаў, што ён гэтага рабіць не будзе — «сам здымай»... Лейтэнанцік не адважыўся...

Хутчэй за ўсё ён быў камуністам, але ж у акопах, як кажуць, не бывае бязбожнікаў: у душы, пэўна, кожны верыў у найвышэйшыя сілы, якія засцерагуць, дапамогуць не страціць мужнасці, справіцца з ворагам, вярнуцца дамоў.

І яшчэ. Нарадзіўшыся ў пачатку мінулага стагоддзя ў вёсцы, Васіль Аляксандравіч не слухаў радыё, не глядзеў тэлевізар, бо іх не было, і таму з цікавасцю назіраў за людзьмі іншых нацыянальнасцяў; распавядаў пра тое, як байцы, штодня назіраючы кроў і смерць, стараліся падтрымліваць адзін аднаго, не ачарствець душой...

Прадзед, у прыватнасці, часта ўспамінаў пра мусульманіна, які не раз адмаўляўся ад ежы, бо яму нельга было ўжываць свініну... А ў народзе ж не дарэмна кажуць, што чалавек галодны ні на што не годны: ваяваць — і пагатоў! Таварышы па зброі прыдумалі выйсце: з кавалачкаў мяса здымалі сала (каб не разабраць было, чым запраўлена каша) і перадавалі кацялок байцу. На пытанне «Свін?» упэўнена казалі: «Не!» і потым ведалі, што іх таварыш падсілкаваўся, не застаўся галодным.

Ці не ў гэтым заключаецца сапраўдная сяброўская падтрымка? Ці не гэта паказчык чалавечнасці?

...Дзядуля заўсёды (пакуль меў сілы) з вялікім задавальненнем хадзіў на святочныя мерапрыемствы да дня Перамогі, сустракаўся з такімі ж ветэранамі. Яны разам слухалі словы віншаванняў і ўдзячнасці, ушаноўвалі памяць загінулых, паміналі іх баявымі ста грамамі. І ўсям'і гэтае свята заўсёды было асаблівым — як пры жыцці дзядулі, так і цяпер.

Чаму? Думаю, таму, па-першае, што амаль не засталося ветэранаў, удзельнікаў вайны, а значыць, няма каму падзяліцца ўсім тады перажытым; а па-другое, свет да жыццё вакол нас такія неспакойныя...

Тым больш шчырай і важкай павінна быць удзячнасць нашым папярэднікам за тое, што перамаглі, за тое, што амаль восемдзесят гадоў людзі маюць магчымасць жыць пад мірным небам, не прачынацца ад выцця сірэн, ад выбухаў і пажараў.

...Мой прадзед Васіль Аляксандравіч Мартос пражыў доўгія 94 гады. Людзі вельмі паважалі яго, бо з адукацыяй «дзве зімы» (па сённяшніх мерках — ніякай) ён вельмі шмат чаго ведаў і ўмеў (тагачасны старшыня калгаса «17 верасня» заўсёды раіўся з ім, калі сеяць і пачынаць жніво, як лепш захаваць ураджай).

Пасля выхаду на заслужаны адпачынак прадзед яшчэ дзесяць гадоў працаваў фуражырам, стаў заслужаным калгаснікам (адмысловую ганаровую стужку разам з іншымі ўзнагародамі захоўвае мая бабуля Марыя).

І дома ў прадзеда ўсё было па-людску: каровка (а то і дзве), свінні, гусі, куры, зямельны надзел, які абрабляўся ўручную,

Прадзед жыў «пад Польшчай», прайшоў дарогамі вайны, што называецца, на сабе адчуў, што такое калектывізацыя, гады перабудовы. Але дакладна ведаю: не часы вызначаюць учынкі чалавека, а чалавек сам: яго людскасць, яго душа і яго прынцыпы. Васіль Аляксандравіч ніколі не казаў, што не той узрост і не тое здароўе: кожны дзень яго быў у клопатах і справах. І для нас, яго наступнікаў, гэта стала прыкладам для выбару кім быць і якімі быць.

...Жыццё не стаіць на месцы. Новы час прыносіць новыя выпрабаванні, новыя перамогі, новых герояў. Але кожнае пакаленне спраўляецца з выклікам, у першую чаргу дзякуючы таму, што пераймае вопыт старэйшых.

Мой прадзед — звычайны чалавек, якіх тысячы, але я дакладна ведаю, што менавіта яго ўнутраны стрыжань, яго прынцыпы, яго характар, яго працавітасць былі прыкладам для многіх — у сям'і, у радні, сярод аднавяскоўцаў.

Сын і ўнук майго прадзеда выбралі прафесію вайскоўца і з гонарам служылі, захоўваючы мір і шчасце на роднай зямлі. Мая мама — настаўніца. Гэтую ж прафесію выбрала я. Вучуся, стараюся быць годным чалавекам, захоўваць сямейныя каштоўнасці і памяць продкаў.

**Валерыя Русак, студэнтка,**
*г. Мінск.*

***P.S.*** *Фотаздымак дзядулі не найлепшай якасці, але ўсім нам вельмі дарагі, бо адзіны з часоў вайны.*

---

## Памяць

# «Цяжка прыйшлося, аднак людзі змагаліся і цярпелі, не здаваліся»

**Сёлета 80 гадоў з дня вызвалення краіны ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, якое дасталася вельмі дарагой цаной і ў якім важную ролю адыграў партызанскі рух. Удзел у ім бралі мае бацькі Ганна Паўлаўна і Канстанцін Дзмітрыевіч Берднікі. Толькі пажаніўшыся, яны жылі за сотні кіламетраў ад Мінска, у невялікім гарадку Капыль, чакалі першынца.**



Калі пачалася вайна, Косця накіраваўся ў ваенкамат, але там ужо ішла эвакуацыя. Тату ды іншым хлопцам-мужчынам параілі самастойна шукаць нашы войскі. З надзеяй сустрэць рэгулярныя часці група рушыла ў бок Мінска і праз пару дзён, на падыходзе да сталіцы, даведалася, што ў горадзе немцы... Абходнымі шляхамі прыйшлося вяртацца назад.

У верасні 1941-га ў маладой сям'і нарадзіўся сын. У пачатку 1942-га фашысты сталі настойліва вербаваць нашых мужчын у паліцаі, і ў той жа час у лясах Капыльшчыны пачалі ствараца партызанскія атрады. Ганна і Канстанцін вырашылі пайсці туды разам (маладой матулі з дзіцем небяспечна было заставацца дома). Пад выглядам збораў на палявыя работы сям'я загрузілася ў воз і дабралася да партызанскага атрада.

Косцю адразу прызначылі ў конную разведку, Ганна займалася гаспадаркай. Цяжка прыйшлося, аднак людзі змагаліся і цярпелі, не здаваліся, бо вораг прыйшоў на нашу зямлю, каб зрабіць нас рабамі.

У час адной з бамбёжак Ганна, прыкрываючы сабою дзіця, была паранена. Косця, вяртаючыся з заданняў, здаралася, паказваў ёй у некалькіх месцах прастрэленую шапку.

...Дзеці, унукі Ганны Паўлаўны і Канстанціна Дзмітрыевіча *(на здымку)* ведаюць гэта па расповедах бацькоў і дзядоў. Наступныя ж пакаленні павінны не толькі захаваць гэту памяць, але і перадаць далей.

**Сяргей Берднік, сын.**
*г. Мінск.*

---

## Свой погляд

# Пасееш прывычку — пажнеш характар...

**У салонах магілёўскіх аўтобусаў і тралейбусаў часта назіраю такую карціну: у пярэднія дзверы заходзіць нехта старэнькі, з кавенькай, азіраецца — шукае вачыма, дзе б прысесці, а месцы (нават з пазнакай для інвалідаў) занятыя хлопцамі і дзяўчатамі, маладымі жанчынамі і мужчынамі. Уткнуўшыся ў свае смартфоны, яны нікога вакол не бачаць... Здаралася, я нават задаваў пытанне: «Можа, хто з «інвалідаў» уступіць месца бабулі?» Вось тады ўжо нехта ўставаў.**

Раней, помніцца, кіроўцы і кандуктары звярталіся да пасажыраў з аб'явамі, з напамінамі, як трэба сябе паводзіць. Апошнім часам такіх зваротаў нешта не чуваць. Маладыя людзі спакойна займаюць месцы, спакойна едуць, і прычыну гэтага я разумею. Нашы дзеці і ўнукі змалку прывыкаюць да таго, што ўсё найлепшае аддаецца ім... А вось у народаў Каўказа ці не ў крыві — павага да старэйшых.

Як гэта выхоўваецца, раскажу на канкрэтным прыкладзе. Аднойчы я зайшоў у вагон цягніка, які ішоў у Баку. Сесці не было дзе: усе месцы занятыя, аднак мужчына гадоў сарака штурхнуў пад локаць хлапчука (трэба разумець, старэйшага сына... Побач сядзелі трое малых) і моўчкі загадаў устаць.

Я хацеў спыніць хлопчыка, сказаў, што мне зусім няцяжка — магу пастаяць. Але бацька ўжо мне ціха загадаў: «Сядайце. Так трэба... Потым скажу, навошта».

І сапраўды, калі мы дабраліся да месца, гэты шматдзетны азербайджанец на некалькі крокаў адвёў мяне ад малых і сказаў: «Ведаеце, у вагоне я клапаціўся не столькі пра вас... Я хачу, каб мае дзеці з павагай ставіліся да людзей пажылых — і сваіх, і чужых... Калі сёння мой сын не ўступіць месца вам, калі ён не прывыкне паважаць старэйшых, то падрасце і не будзе паважаць мяне».

Вось такі, можна сказаць, асабісты інтарэс, вось такая народная мудрасць. Не грэх бы яе засвоіць і нам.

**Віктар Арцём'еў,**
*г. Магілёў.*

---

## Чалавек — чалавеку

# З НАДЗЕЯЙ...

*Я ведаю лекі ад грубага слова,*
*Ад думак маркотных,*
*ад страху і стрэсу,*
*Ад кроку спантаннага,*
*выпадку злога...*
*Усмешка — ахоўнік маіх інтарэсаў.*

*Аддаць задарма —*
*не шкада абсалютна!*
*Я з ёй адчуваю сябе аптымісткай*
*У лесе ціхуткім,*
*натоўпе шматлюдным,*
*Прыгожай і смелай,*
*як тая ж артыстка!*

*Мой твар*
*упрыгожыць яна без памады,*
*Асветліць пакой*
*у любое надвор'е,*
*Пакіне каханаму ціхую радасць*
*І можа, у адказ мне —*
*усмешак сузор'е?*

***Алена Бельская,***
*г. Маладзечна.*